1

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П.М.МАШЭРАВА»

Факультэт гуманітарыстыкі і моўных камунікацый

Кафедра гісторыі і культурнай спадчыны

Дапушчана да абароны
"09" 02 2021г.
Загадчык кафедры
А.М.Дулаў

МАГІСТАРСКАЯ ДЫСЕРТАЦЫЯ
СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ КАЛГАСНАГА ЛАДУ НА ГЛЫБОЧЧЫНЕ З 1949 ПА 1960 ГГ (НА ПРЫКЛАДЗЕ КАЛГАСА "ГЕРОЙ ПРАЦЫ")

Спецыяльнасць 1-21 80 15 "Гісторыя"

Башун Ядвіга Дзмітрыеўна,
магістрант

Навуковы кіраўнік:

Тогулева Алена Дзмітрыеўна ,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Віцебск, 2021

## Рэферат

Магістарская дысертацыя 62 с., 82 крыніцы, 3 дадатакі.

АДНААСОБНІКІ, АРЦЁЛЬ, КАЛГАС, ПРАЎЛЕННЕ, ПРАЦАДЗЕНЬ, СТАТУТ, СХОД, УПАЎНАВАЖАНЫ, ШТРАФ.

**Аб'ект даследавання** – працэс калектывізацыі на Глыбоччыне ў 1949 – 1960 гадах.

**Прадмет даследавання** – калгас “Герой працы” ў 1949 – 1960 гадах.

**Мэта працы** – прааналізаваць працэс станаўлення і развіцця калгаснага ладу на Глыбоччыне з 1949 па 1960 гг. ( на прыкладзе калгаса "Герой працы").

**Метады даследавання**: індукцыя, дэдукцыя, аналіз, сінтэз, гісторыка-параўнальны метад, гісторыка-сістэмны метад, гісторыка-статыстычны метад.

**Элементы навізны**. Прадстаўленая дысертацыя з'яўляецца даследваннем канкрэтнай гаспадаркі на тэрыторыі Глыбоцкага раёна, якая пачынала сваё станаўленне і дзейнасць у 1949-1960 гадах. Задзейнічаныя ў даследванні архіўныя крыніцы выкарыстоўваюцца ўпершыню.

**Тэарэтычная і практычная значнасць**. Праца будзе карыснай для краязнаўцаў і настаўнікаў гісторыі, а таксама для вучняў агульнаадукацыйных школ для напісання даследчых работ і больш грунтоўнага вывучэння гісторыі сваёй малой радзімы. Яшчэ гэта праца будзе вельмі дарэчы сучасным кіраўнікам сельскагаспадарчых прадпрыемстваў для вывучэння і ўсведамлення многіх падзей, а таксама працэсаў, якія папярэднічалі цяперашняму стану аграрнага сектара нашай краіны.

# Змест

Спіс скарачэнняў ........................................................................4
Уводзіны..........................................................................................5
Глава 1. Утварэнне і праблемы першых сельгасарцеляў. (1949 – 1951гг)
1.1. Арганізацыйныя праблемы першых сельгасарцеляў.............. 11
1.2. Вытворчая дзейнасць сельгасарцеляў............................. 18
Глава 2. Аб'яднаная гаспадарка "Герой працы"
2.1. Далейшае умацаванне калгаснага ладу...............................34
2.2. Павелічэнне гаспадарчага патэнцыялу калгаса "Герой працы"... 42
Заключэнне ................................................................................ 53
Спіс выкарыстаных крыніц. ........................................................56
Дадатак ........................................................................................60

## Уводзіны

У эканоміцы большасці краіны свету аграрны сектар з'яўляецца адным з самых найважнейшых. А стан, у якім ён знаходзіцца, аказвае значны ўплыў на розныя іншыя галіны народнай гаспадаркі. Якімі б не былі дасягненні навукова-тэхнічнага прагрэса, але зямля па-ранейшаму застаецца важнейшым сродкам вытворчасці і ад вырашэння аграрных праблем залежыць забеспячэнне ў краіне харчовай бяспекі, а перапрацоўчай прамысловасці – сыравінай. Таму аграрнае пытанне з'яўляецца адным з ліку найважнейшых праблем вывучэння сучаснай гісторыі Беларусі.

Аграрная палітыка савецкай улады памяняла не толькі формы і метады гаспадарання, але і цалкам змяніла знешняе аблічча заходнебеларускіх вёсак. Адзіна правільнымі, сацыялістычнымі формамі гаспадарання на зямлі, ў даследуемы перыяд, пачалі лічыцца калектыўныя гаспадаркі - сельскагаспадарчыя арцелі, калгасы, а таксама савецкія гаспадаркі - саўгасы. Вельмі важным і актуальным сёння з'яўляецца вывучэнне лакальнай гісторыі і гісторыі штодзённасці, непасрэдна звязанай з тым перыядам. 2021 год з'яўляецца юбілейным годам з пачатку першага ўзбуйнення калгаса "Герой працы" Глыбоцкага раёна. І вось ужо праз 70 гадоў можна ўпэўнена рабіць аналіз і высновы з усёй гэтай калгаснай канструкцыі таго часу. Таму мы засяроджваемся на вывучэнні гісторыі калектывізацыі ў канкрэтных населеных пунктах на пачатковых яе этапах. Актуальнасць дадзенай тэмы даследавання абумоўлена тым, што ведаючы і ўлічваючы гістарычны вопыт, можна больш эфектыўна і рацыянальна праводзіць аграрную палітыку ў сучаснай Беларусі.

**Мэта даследвання** – прааналізаваць працэс станаўлення і развіцця калгаснага ладу на Глыбоччыне з 1949 па 1960 гг. ( на прыкладзе калгаса "Герой працы").

Для дасягнення пастаўленай мэты неабходна вырашыць наступныя **задачы**:

1) даследаваць працэс утварэння першых сельгасарцеляў на Глыбоччыне і іхарганізацыйныя праблемы;

2) прааналізаваць асноўныя накірункі і выявіць станоўчыя і адмоуныя вынікі вытворчай дзейнасці сельгасарцеляў;

3) прасачыць эвалюцыю калгаснага ладу ў вёсках Глыбоцкага раёна, якія былі аб'яднаныя ў межах калгаса "Герой працы";

4) высветліць прычыны росту гаспадарчага патэнцыялу калгаса "Герой працы".

**Аб'ектам даследвання** з'яўляецца працэс калектывізацыі на Глыбоччыне ў 1949 – 1960 гадах.

**Прадмет даследвання** – калгас "Герой працы" ў 1949 – 1960 гадах.

Храналагічныя межы даследвання абумоўлены пачаткам у гэтым рэгіёне актыўнай фазы калектывізацыі ў 1949 годзе, і да канчатковага фарміравання аблічча калгаса "Герой працы" Глыбоцкага раёна ў 1960 годзе.

**Гістарыяграфія**. Гістарычнае развіццё заходнебеларускай вёскі ў сярэдзіне XX стагоддзя атрымала адлюстраванне ў айчыннай гісторыяграфіі. Адной з першых найбольш вядомых абагульняючых прац з'яўляецца сумеснае даследаванне Г. А. Барадача і К. І. Дамарада "Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях Беларускай ССР" [1], якое выйшла яшчэ ў 1959 годзе. У ёй аўтары закранаюць працэс калгаснага будаўніцтва ў перадваенныя гады (1939-1941), а таксама пытанні стварэння перадумоваў для перабудовы аграрнага сектару і масавай калектывізацыі ў 1944 – 1952 гадах. Асаблівая ўвага тады надавалася ролі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза ў аграрных пераўтварэннях на вёсцы, яе заслугам у ліквідацыі дробнага сялянскага землеўладання і аб'яднанні сялян у

сельскагаспадарчыя арцелі. Праца цалкам адпавядае ўзроўню той гістарычнай думкі, якая панавала ў канцы 1950-х гадоў, калі толькі вядзенне калектыўнай гаспадаркі лічылася адзіна правільным накірункам развіцця сельскай гаспадаркі ў краіне, а калгасы – самай аптымальнай і адзіна правільнай формай гаспадарання на зямлі, прымусовы ж характар аграрных перамен тады ўвогуле адмаўляўся.

У далейшыя гады паглыбляецца вывучэнне працэсу аграрных адносін, сялянства і сельскай гаспадаркі заходніх абласцей Беларусі. Кола выкарыстоўваемых крыніц значна пашыраецца, аналіз даследуемых пытанняў становіцца больш featuresнабаковым. У навуковым асяроддзі стала зацверджвацца палажэнне, што сацыялістычныя перамены на вёсцы ў заходніх абласцях Беларусі ажыццяўляўся на падставе ленінскага кааператыўнага плана і вопыту гэтай работы ў СССР.

У 1975 годзе выйшаў з друку пяты том “Гісторыі Беларускай ССР” [7]. У гэтай працы праблемы гісторыі пераменаў у беларускай вёсцы таксама знайшлі сваё адлюстраванне. На тым этапе развіцця гістарычнай навукі па-ранейшаму заставалася актуальным пытанне ролі ідэалагічнага кіраўніцтва кампартыяй Беларусі працэсаў рэфармавання сельскай гаспадаркі.

Вялікі ўклад у вывучэнне гісторыі заходнебеларускай вёскі савецкага перыяду ўнеслі працы А.П. Белязо “Беларуская вёска ў пасляваенныя гады (1945 – 1950)” і “Крестьянство Белоруссии на пути к развитому социализму (1951 – 1960 гг.)” [4;5]. У гэтых працах паказаны цяжкія наступствы нямецка-фашысцкай акупацыі ў сельскай гаспадарцы, сацыяльная эвалюцыя сялянства ў гады чацвёртай пяцігодкі, меры партыі і ўраду па развіцці вёскі і інш. Аграрнае развіццё заходніх абласцей Беларусі таксама знайшло адлюстраванне ў даследаванні А. П. Купрэевай “Возрождение народного хозяйства Белоруссии” [82]. Аўтар аналізуе пераўтварэнні ў

сельскай гаспадарцы, аднак не раскрывае адносінаў сялянства да палітыкі, якую праводзіла савецкая ўлада.

А з апошніх даследаванняў сучасных беларускіх гісторыкаў можна назваць працы В. А. Белазаровіча "Западнобелорусская деревня в 1939 – 1953 годах" [2] і "На пераломе: беларуская вёска ў канцы 1940-х – 1950-я гады" [3]. Гэтыя працы разглядаюць аграрныя пераўтварэнні савецкай улады ў вёсцы з усімі іх негатыўнымі наступствамі і робяцца высновы, што працэс калектывізацыі праходзіў вельмі складана і палітыка савецкай улады праводзілася не ў інтарэсах сялянства, а зыходзячы толькі з дзяржаўнай неабходнасці.

У 2011 годзе выйшаў у свет шосты том "Гісторыі Беларусі" [6], у якім раскрываецца гісторыя беларускага народа ад заканчэння Другой сусветнай вайны да сучаснасці. Ён утрымлівае змястоўны матэрыял пра пасляваеннае становішча сельскай гаспадаркі рэспублікі, а таксама паказаны ўзаемаадносіны дзяржавы і сялянства, падатковая палітыка дзяржавы адносна вёскі. Грунтоўна паказана калектывізацыя ў заходніх рэгіёнах Беларусі, памылкі і поспехі пры яе правядзенні.

Такім чынам, беларуская гістарычная навука назапасіла шэраг прац па айчыннай аграрнай гісторыі, якія раскрываюць асобныя бакі даследуемай намі праблемы.

**Крыніцамі** па гісторыі калектывізацыі ў вёсках Дзеркаўшчынскага сельсавета Глыбоцкага раёна Полацкай вобласці з'яўляюцца дакументы фондаў занальных дзяржаўных архіваў у гарадах Глыбокае і Маладзечна. Фонды ўтрымліваюць інфармацыю пра працэс калектывізацыі ў згаданых населеных пунктах. Намі скарыстаныя матэрыялы ўпраўлення сельскай гаспадаркі і нарыхтовак выканкама Глыбоцкага райсавета [42], Ф. 31 (Дзеркаўшчынскі сельскі Савет дэпутатаў працоўных і яго выканкам) [27], Ф. 109 (Сельскагаспадарчыя арцелі(калгасы) Глыбоцкага раёна Полацкай (з

08.01.1954 – Маладзечанскай) вобласці, якія ліквідаваныя ў 1950 – 1960-я гады) [23-41, 43-50], і Ф. 32 (Калектыўная гаспадарка(калгас) “Герой працы”, в. Дзеркаўшчына Тумашаўскага (з 19.07.1971 – Карабоўскага) сельскага Савета Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці) [28-47, 59-62] Занальнага Дзяржаўнага архіва г. Глыбокае. Гэтыя матэрыялы прадстаўляюць сабой рашэнні выканкамаў, спісы калгаснікаў і абагульненай маёмасці, пратаколы агульных сходаў і паседжанняў праўлення, заявы аб уступленні ў калгас, статуты сельгасарцеляў, дзяржпланы і розныя справаздачы. Усе гэтыя матэрыялы вартыя даверу. Таксама вельмі карысныя звесткі прадстаўленыя краязнаўчымі матэрыяламі Дзеркаўшчынскай сельскай бібліятэкі [81]. Архіўныя фонды таксама ўтрымліваюць эканамічныя даведкі, праекты расшырэння апрацоўваемых палеткаў, схемы-чарцяжы калгаснага землекарыстання, рашэнні і пастановы дзяржаўных органаў. Зацверджаныя пячаткамі і асабістымі подпісамі тагачасных дзяржаўных служачых, яны таксама не выклікаюць сумневаў ў праўдзівасці інфармацыі. У даследванні быў задзейнічаны Ф. 550 (Упраўленне сельскай гаспадаркі выканаўчага камітэта Маладэчанскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных) [80]. З гэтага фонда прадстаўленыя матэрыялы нагляднай агітацыі таго часу, якія выкарыстоўваліся для працаўнікоў сельскай гаспадаркі. Гэтыя матэрыялы таксама вартыя даверу, бо яны змяшчаюць у сабе выходныя дадзеныя і надрукаваныя ў дзяржаўнай друкарні.

**Перыядычны друк** з’яўляецца таксама важнай крыніцай інфармацыі для даследавання. Ён прадстаўлены газетай “Сцяг камунізма”, друкаваным органам Глыбоцкага райкама Камуністычнай партыі Беларусі і раённага Савета дэпутатаў працоўных [9 - 26].

Працуючы над дысертацыйным даследваннем, аўтарам выкарыстоўваліся агульнанавуковыя метады даследвання, а таксама і

спецыяльна-гістарычныя. Да першых адносяцца аналіз, сінтэз, індукцыя і дэдукцыя. У якасці спецыяльна-гістарычных метадаў выкарыстоўваліся гісторыка-параўнальны, гісторыка-статыстычны, гісторыка-сістэмны і гісторыка-тыпалагічны метад.

**Асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Першыя сельгасарцелі былі ўтвораныя і існавалі ў межах адной, альбо некалькі невялікіх вёсак. Яны пачыналі сваю гаспадарчую дзейнасць з разлікам толькі на свае сілы. У той час падтрымка з боку дзяржавы была мізэрнай.

2. Дзейнасць кіраўніцтва калгаса вялася пад няспынным кантролем мясцовага сельскага выканаўчага камітэта і райкама Камуністычнай партыі. Яны аказвалі моцны ўплыў на жыццё і гаспадарчую дзейнасць калгаса.

3. З узбуйненнем калгасаў назіраецца працэс умацавання калгаснай сістэмы. У гаспадарцы пачынаюць з'яўляцца падрыхтаваныя кіруючыя кадры і спецыялісты. Паступовa гаспадарка пачынае набываць эканамічную моц.

4. Добрых вынікаў калгас дасягае напрыканцы 1950-х гадоў. Але праблемы працоўнай культуры і дысцыпліны, абыякавых адносін да працы і да грамадскай маёмасці да таго часу ў калгасе так і не былі вырашаны .

5. Працэс калектывізацыі меў сваю спецыфіку і асаблівасці. Яны своечасова не былі заўважаныя і ўлічаныя дзяржаўнымі органамі. І гэта ў далейшым паўплывала на развіццё калгаса.

Пададзеная заяўка на ўдзел у IV навукова-практычнай канферэнцыі маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі “ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы” (Мінск, 14-16 красавіка 2021), дзе будуць апрабоўвацца вынікі дысертацыйнага даследвання.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыйнае даследванне складаецца з уводзін, асноўнай часткі, якая ўключае ў сябе дзве главы, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц і дадаткаў.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Барадач Г.А., Дамарад К.І. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях Беларускай ССР. – Мн., 1959 – 166 с.
2. Белозорович В.А. Западнобелорусская деревня в 1939 – 1953 годах. – Гродно, 2004г. – 148 с.
3. Белазаровіч Віктар. На пераломе: беларуская вёска ў канцы 1940-х – 1950-я гады // ARCHE. - 2011г. - №10 С. 1 – 34.
4. Белязо А. П. Беларуская вёска ў пасляваенныя гады (1945 – 1950) – Мн., 1974г. – 176 с.
5. Белязо Е.П. Крестьянство Белоруссии на пути к развитому социализму (1951 – 1960гг.) / Ред. Н.В. Власенко. – Минск, 1982 г. – 206 с.
6. Гісторыя Беларусі. У 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946 – 2009 гг / Л.Лыч [і інш.]; рэд.калегія: М.Касцюк (гал.рэд) [і інш.]. – Мінск: Современная школа, Экоперспектива, 2011. – 728 с.
7. Гісторыя Беларускай ССР: У 5 т. / Акад. навук БССР. Ін-т гісторыі. – Мн., 1975. – Т. 5. – 776 с.
8. Глыбоччына: ад старажытнасці да сучаснасці / рэдкал.: Т.У.Бялова [ і інш.]. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – 735 с.
9. Не марудзіць з падрыхтоўкай да вясны // Сцяг камунізма. – 1949. - № 5. - С. 1.
10. Завяршылі засыпку насення // Сцяг камунізма. – 1949. - № 26. –С. 2.
11. Масавае ўступленне сялян у калгас // Сцяг камунізма. – 1949. - № 67. – С. 2.
12. 78 новых калгасаў // Сцяг камунізма. – 1949. - №72. – С. 1.
13. Ход веснавой сяўбы // Сцяг камунізма. – 1950. - № 32. – С. 1.
14. Ход веснавой сяўбы // Сцяг камунізма. – 1950. - № 34. – С. 1.
15. Ход веснавой сяўбы // Сцяг камунізма. – 1950. - № 35. – С.1.
16. Рыхтуюцца да сенакосу // Сцяг камунізма. – 1950. - № 42. – С. 2.
17. Выканалі план сяўбы // Сцяг камунізма. – 1950. - № 45. – С. 1.

18. У палоне бестурботнасці // Сцяг камунізма. – 1950. - № 45. - С. 3.
19. Пагаворым аб прывычках // Сцяг камунізма. – 1950. - № 52. – С. 2.
20. Узбуйненне калгасаў – адказнейшая справа // Сцяг камунізма. – 1950. - № 63. – С. 2.
21. Падтрымліваем заклік перадавікоў // Сцяг камунізма. – 1950. - № 65.– С. 2.
22. Зіма не будзе чакаць // Сцяг камунізма. –1950.- № 79. – С. 1.
23. Развіваецца грамадская жывёлагадоўля // Сцяг камунізма. – 1950. - № 81. – С. 2.
24. Больш ільнопрадукцыі дзяржаве // Сцяг камунізма. –1950. - № 83. – С. 1.
25. Узмацніць нарыхтоўку і вывазку лесу // Сцяг камунізму. – 1950. - № 98. – С. 1.
26. Сезонны план перавыкананы // Сцяг камунізму. – 1950. - № 98. – С. 2.
27. Установа "Занальны Дзяржаўны архіў у г. Глыбокае" (ЗДАГлб). – Ф. 31. Воп. 2. Спр. 1. – 28 арк.
28. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр.1. – 10 арк.
29. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 2. – 11 арк.
30. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 3. - 14 арк.
31. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 4. – 68 арк.
32. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 6. – 10 арк.
33. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 21. – 12 арк.
34. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 26. – 10 арк.
35. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 35. – 14 арк.
36. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 5. – 15 арк.
37. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 7. – 6 арк.
38. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 18. – 10 арк.
39. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 27. – 21 арк.
40. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 14. – 45 арк.
41. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 45. – 23 арк.
42. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 8. – 10 арк.
43. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 9. – 12 арк.

44. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 10. – 14 арк.
45. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 11. – 8 арк.
46. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 12. – 121 арк.
47. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 13. – 38 арк.
48. ЗДАГлб. – Ф. 109. Воп. 3. Спр. 23. – 12 арк.
49. ЗДАГлб. – Ф. 109. Воп. 3. Спр. 4. – 14 арк.
50. ЗДАГлб. – Ф. 109. Воп. 3. Спр. 9. – 10 арк.
51. ЗДАГлб. – Ф. 109. Воп. 3. Спр. 21. – 3 арк.
52. ЗДАГлб. – Ф. 129. Воп. 1. Спр. 79. – 16 арк.
53. ЗДАГлб. – Ф. 129. Воп. 1. Спр. 80. – 20 арк.
54. ЗДАГлб. – Ф. 129. Воп. 3. Спр. 56. – 4 арк.
55. ЗДАГлб. – Ф. 129. Воп. 3. Спр. 58. – 18 арк.
56. ЗДАГлб. – Ф. 38. Воп. 1. Спр. 1. – 34 арк.
57. ЗДАГлб. – Ф. 38. Воп. 1. Спр. 8. – 9 арк.
58. ЗДАГлб. – Ф. 38. Воп. 1. Спр. 14. – 17 арк.
59. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 23. – 48 арк.
60. ЗДАГлб. – Ф. 32. Воп. 1. Спр. 27. – 57 арк.
61. ЗДАГлб. – Ф. 38. Воп. 1. Спр. 17. – 25 арк.
62. ЗДАГлб. – Ф. 38. Воп. 1. Спр. 19. – 14 арк.
63. ЗДАГлб. – Ф. 39. Воп. 1. Спр. 1. – 9 арк.
64. ЗДАГлб. – Ф. 39. Воп. 1. Спр. 3. – 11 арк.
65. ЗДАГлб. – Ф. 39. Воп. 1. Спр. 6. – 19 арк.
66. ЗДАГлб. – Ф. 39. Воп. 1. Спр. 7. – 27 арк.
67. ЗДАГлб. – Ф. 39. Воп. 1. Спр. 8. – 12 арк.
68. ЗДАГлб. – Ф. 39. Воп. 1. Спр. 13. – 8 арк.
69. ЗДАГлб. – Ф. 39. Воп. 1. Спр. 14. – 19 арк.
70. ЗДАГлб. – Ф. 39. Воп. 1. Спр. 15. – 10 арк.
71. ЗДАГлб. – Ф. 87. Воп. 1. Спр. 2. – 21 арк.
72. ЗДАГлб. – Ф. 87. Воп. 1. Спр. 3. – 14 арк.
73. ЗДАГлб. – Ф. 87. Воп. 1. Спр. 4. – 7 арк.

74. ЗДАГлб. – Ф. 33. Воп. 1. Спр. 1. – 31 арк.

75. ЗДАГлб. – Ф. 33. Воп. 1. Спр. 2. – 12 арк.

76. ЗДАГлб. – Ф. 33. Воп. 1. Спр. 3. – 25 арк.

77. ЗДАГлб. – Ф. 35. Воп. 1. Спр. 1. – 11 арк.

78. ЗДАГлб. – Ф. 35. Воп. 1. Спр. 5. – 7 арк.

79. ЗДАГлб. – Ф. 133. Воп. 1. Спр. 7. – 9 арк.

80. Установа "Занальны Дзяржаўны архіў у г. Маладзечна". – Ф. 550. Воп. 2. Спр. 564. – 7 арк.

81. Краязнаўчыя матэрыялы Дзеркаўшчынскай сельскай бібліятэкі Глыбоцкага раёна.

82. Купреева А.П. Возрождение народного хозяйства Белоруссии. – Мн, 1976 г. – 224 с.